

Тамара Барадзёнак

# У промнях зары вечаровай




# *Тамара Барадзёнак*

# У промнях зары вечаровай

***

Вершы

*Году міру і стварэння прысвячаецца*

*Усё часцей у роднай Беларусі*
*Прыносяць змены шпаркія гады,*
*Ды ўсё ж застацца ў вершах спадзяюся*
*Я на сваёй Ушаччыне заўжды.*

*Тамара Барадзёнак*

# На ”Прарыве“

Гамоняць няспынна дубы на ”Прарыве“
Пра мужнасць герояў, што тут паляглі.
Пра тое, як жыцці свае маладыя
За волю Радзімы яны аддалі.

Паклонімся ж сёння ім нізка, нашчадкі,
За мірнае неба над нашай зямлёй.
Хай кветкі заўжды да падножжа Салдата
Кладуцца ў знак памяці нашай жывой.



## Леса Ушаччины

Леса Ушаччины! Леса бескрайние!
Раздолье пышное и благодать…
Доверьте нам свои вы думы тайные,
Чтобы душою их могли принять.

Вы много помните, вы много знаете
О тех минувших днях, о днях лихих.
Тех, кто нам мир сберёг, не забываете
И в песнях славите бесстрашных их.

Затихли грозы те, минули дни войны
И небо мирное над нами вновь.
Леса Ушаччины! Опять шумят они
И в песнях тихих тех к земле любовь.

Пусть будет мир всегда на всей земле родной
И не кружит над ней несчастья смерч.
Леса Ушаччины! Раздолье и покой…
С любовью будем вас всегда беречь.



***Да 200-годдзя праваслаўнага храма святой вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы ў аграгарадку Арэхаўна Ушацкага раёна***

Са святам вялікім вас, вернікі,
Святкуе прыход юбілей.
Ужо дзвесці год у Арэхаўне
Храм чуе малітвы людзей.

Каторае ўжо пакаленне
Святы ваш наведвае храм.
У шчырае чуе маленне
Гасподзь, памагаючы нам.

За вас Параскева святая
Прад Богам малітвы тварыць.
Ахоўвае, аберагае,
Каб людзям лягчэй было жыць.

З малітвай растуць у вас дзеці,
З бацькамі прыходзяць у храм.
Так быць і павінна на свеце,
Каб з вераю кожны ўзрастаў.

Квітнее заўжды хай Арэхаўна,
У храме малітвы гучаць.
Хай будзе духоўнай патрэбаю
Для кожнага Бога ўслаўляць.

Святая глыбокая вера
У сэрцах хай вечна жыве.
Над вамі заўжды Параскева
Няхай лёгкай хмаркай плыве.

Як крыламі белая птушка
Хай вас засланяе яна
І вера святая вам душы
Хай поўніць да самага дна.





### *В честь трёх святых мучениц Минодоры, Митродоры и Нимфодоры, имя которых носит православный храм в г.п. Ушачи*

Наш храм носит имя трёх славных сестриц,
Образ святой их с любовью мы чтим.
Молимся, просим о помощи их,
За покровительство благодарим.

В них вера была глубока и чиста,
Не удалось палачам их сломить.
Души сквозь муки ушли в небеса,
Чтобы о нас вечно Бога молить.



Старшей пришлось первой муки терпеть,
И Минодора их все приняла.
Не отреклась она – выбрала смерть,
Вера была в ней сильней мук и зла.

Не вышло заставить жестоким врагам
И Митродору веру предать,
И средней душа отошла к небесам,
Чтоб тоже невестой Христовой там стать.

Младшей сестрице последней испить
Горькую чашу мучений пришлось.
Не удалось Нимфодору сломить –
Принял и третью сестрицу Господь.

Преклоним же, люди, колена свои
Пред образом мучениц этих святых,
Пред силой великою к Богу любви,
Попросим святого предстательства их.





***В честь престольного праздника в храме святых мучениц Минодоры, Митродоры и Нимфодоры г.п. Ушачи***

Престольный праздник снова мы встречаем,
Любовью к Господу наполнен каждый миг.
Мы взоры благодарно устремляем
На лики покровителей святых.



Святые Минодора, Митродора, Нимфодора
За нас пред Богом молятся всегда,
Чтобы на нашем на земном просторе
Нас обходила стороной беда.

Молитесь же за нас, святые сёстры,
А мы вас будем свято почитать.
Пускай летят лет бесконечных вёрсты,
А вера вечно будет нас спасать.

# Крещение Господне

Январский вечер ясный и морозный
Крещение Господне нам принёс.
На тёмно-синем небе блещут звёзды,
Луна, как королева, среди звёзд.

Не только в водоёмах – из-под крана
Водица в праздник этот не проста:
В ней свойства той, которой в Иордане
Крестили Вседержителя Христа.

На реках и озёрах прорубают
Крещенские купели в этот день.
Вода здоровьем, силой наполняет
Купающихся в проруби людей.

Идут в храм Божий люди помолиться,
Спасителя с любовью восхвалить,
Воды святой набрать и ей омыться,
Очистить душу, тело укрепить.

Отец небесный всем нам помогает,

На всё всегда подскажет нам ответ.

И только сила веры защищает

Нас от напастей, горестей и бед.

Пусть на земле спокойно, мирно будет,

Пускай взойдёт счастливая заря.

С Крещением Господним всех вас, люди!

Всем мира, благоденствия, добра!





## Купальская ноч

Прыгожаю наўздзіў чароўнай казкаю
Жыве ноч гэта ў памяці маёй…
Гарэла ярка вогнішча купальскае,
Ляцеў у неба іскраў цэлы рой.

Плыў месяц ясны над ляснымі шатамі,
Расквечваў чорны аксаміт начы.
Нібыта, быў у змове ён з дзяўчатамі –
Ім варажыць хацеў дапамагчы.

Блішчэла люстра возера загадкава,
Вянкі аддаючы на волю хваль,

І песні, што навучаны прабабкамі,
Надзеяй і журбой сплывалі ўдаль.

Таемнасць цемра па лясах развесіла,
Ой, страшна кветку-папараць шукаць!
Цераз агонь скакала моладзь весела,
Жанчыны лекі-зёлкі йшлі збіраць.

Вось нам бы так, як продкі святкавалі,
Адчуць чароўны подых той начы!..
А іскры даўніх вогнішчаў Купалля
Гарáць дагэтуль у маёй душы.



*Памяці мастакоў, двух Мікалаяў –*
*Гуціева і Абрыньбы*



Вайна Айчынная даўно ўжо ў мінулым,
Але ў народнай памяці жыве.
Нам мастакі, пісьменнікі прачула
Данеслі дзён тых праўду пра яе.

У сорак першым маладыя хлопцы
Вучыліся ў Маскве на мастакоў.
Абодва ваяваць пайшлі – вінтоўкі
Былі замест алоўкаў і лістоў.

Чаго толькі не выпала на долю!
Палон фашысцкі пеклам стаў для іх,
І ў жорсткім тым выпрабаванні волі
Мастацтва не забылі ні на міг.

На знойдзеных плакатах на нямецкіх
Падручным сродкам маляваў мастак,
Каб здзекі над людзьмі нечалавечыя
Нашчадак бачыў менавіта так.

Палонныя за гэта паважалі
І мастакоў адважных берaглі –
Ваду здабыўшы з снегу, аддавалі
Ім, каб паболей маляваць маглі.

Як вырвацца з палону ўдалося,
У Беларусь да нас іх лёс прывёў.
У брыгадзе Дубава байцамі сталі хлопцы –
Прынялі партызаны мастакоў.

Хадзілі на заданні, ваявалі
Разведчык, кулямётчык – мастакі.
Карыкатур на немцаў шмат пісалі,
Лістовак палымяных баявых.

Аднойчы на заданні ўдалося
Знайсці ім з фарбамі нічыйны склад,
І радасцю аж сэрца занялося –
Для іх жа гэта быў сапраўдны клад!

Цяпер была магчымасць і нагода
Пісаць карціны ў нашых мастакоў.
Пісаць пра мужнасць нашага народа,
Пра яго стойкасць, да зямлі любоў.

Пісалі яны ў той ліхі ваенны
І ў мірны пад блакітным небам час.
З удзячнасцю мы сёння гэта цэнім,
Бо памяць дзён тых ёсць сягоння ў нас.

Вось яна – Полацкая й Лепельская зона,
І вочы партызан глядзяць з карцін…
Іх малявалі мастакі ўлюбёна –
І рускі, і хоць крышку асецін.

Яны данеслі праўду, расказалі
Пра жах вайны, разруху, голад, боль.
З вінтоўкай і алоўкам ваявалі
За неба мірнае над нашаю зямлёй



## Нашчадкам

Родны край – нам спадчына ад продкаў,
Тут калыска, гонар і любоў.
Тут вартуюць вечны сон бярозкі
Над спачынам смелых ваяроў.



Тут ляжаць, хто ваяваў бясстрашна
За свабоду роднае зямлі.
Каб было жыццё шчаслівым наша,
Жыцці за Радзіму аддалі.

Помніць свята подзвіг іх павінны
Мы і ўсе, хто будзе пасля нас,
Каб агонь любові да Радзімы
Аніколі ў душы не згас.

Край чужы ласкава не сустрэне
І не будзе шчасця там спаўна.
Родная ж зямелька абагрэе,
Як дзяцей, прытуліць вас яна.



Спадчынай вы гэтай даражыце,
Я вам запавет сягоння шлю:
Родны край, нашчадкі, беражыце,
Беражыце родную зямлю!

## Бізнесовец

*(гумарэска)*

Ох, людцы, расказаць вам ёсць нагода,
Якая выйшла ў мяне прыгода.
У горад я паехала аднойчы
Ды там і зацягалася да ночы.
Усе грошы на пакупкі развяла я,
Наняць таксі ні рубліка не маю.
Стаю каля вакзала ў задуменні
І тут яно – шчаслівае імгненне:
Тармозіць джып шыкоўны, і мужчына
Пытае: ”Можа, згодны Вы, жанчына,
Са мною гэты вечар пакатацца?“
Ад радасці я стала заікацца.
Адказваю, што згодна. Ён выходзіць
І да дзвярэй аўто мяне падводзіць.
Вязе мяне той франт да рэстарана,
Заказвае пітво і марцыпаны.
Іграе музыка, усё блішчыць і ззяе.
– Скажыце, хто Вы? – франта я пытаю.
– Мяне сюды пазваць што за прычына?
– Я бізнесовец, – кажа мне мужчына.
Вось Вас убачыў – ладную такую

І вырашыў – Вам сэрца падарую.–
Сяджу – не ўцямлю: сон гэта ці ява.
Ды тут далей пайшла такая справа:
К нам падыходзяць тры мардавароты,
Адзін з іх – лысаваты, крывароты –
Звяртаецца да франта: ”Мы за доўгам,
Не аддаваў яго ты вельмі доўга.
Гані бабло!“ – А франт мой ім і кажа:
– Так! Зараз аддадзім вам грошы вашы. –
І да мяне: ”Аддай, лапуля, грошы!
Дастань іх з сумкі ты, мая хароша.“
Палезлі вочы аж на лоб мае –
Дурныя ж ён ім жарты выдае.
А бізнесовец кажа мне так міла:
– Ты, можа, грошы, лапачка, згубіла?
Вось жа, панове, вам неспадзяванка –
Згубіла грошы ўсе мая каханка.
Ну, доўг цяпер вы ў яе пытайце
Я ні пры чым – мяне вы не чапайце.
Ой, а далей, як страшны сон, нібыта:
Павезлі мяне к старшаму бандыту.
Траслі мяне, пыталіся, дзе бабкі,
А франт мой збег, аж заблішчалі пяткі.

Во якім злыднем быў мой той знаёмец,

А з гонарам казаў: ”Я бізнесовец!“

Што да мяне – не хутка адпусцілі,

Паверылі, ды толькі прыгразілі:

Калі зманіла – літасці не будзе…

З вузламі ў вёску перла пешкі, людзі!

Цяпер ужо я так не памылюся –

Кахання з бізнесоўцамі баюся.



## Змест


На ”Прарыве“…………………………………… 5
Леса Ушаччины………………………………… 6
Да 200-годдзя праваслаўнага храма святой вялікапакутніцы Параскевы Пятніцы……………… 7
В честь трёх святых мучениц Минодоры, Митродоры и Нимфодоры…………………………... 9
В честь престольного праздника в храме святых мучениц Минодоры, Митродоры и Нимфодоры…………………………………………... 12
Крещение Господне……………………………….. 14
Купальская ноч…………………………………....... 16
Памяці мастакоў, двух Мікалаяў – Гуціева і Абрыньбы…………………………………………….. 18
Нашчадкам…………………………………………. 21
Бізнесовец (гумарэска)……………………………. 23

**Барадзёнак, Т. Д.**

**У промнях зары вечаровай** : вершы / Тамара Дзмітрыеўна Барадзёнак; складальнік і камп'ютарны дызайн Г. М. Кашненка., адказны за выпуск Л. М. Шкаруба. – Ушачы : Ушацкая раённая бібліятэка імя Е. Я. Лось, 2023. – 28 с. : іл., парт.

